# НАШ ГОЛАС



Выпуск № 4

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў*



## *У гэтым нумары:*


- ДЗЕНЬ ЮНАГА ГЕРОЯ-АНТЫФАШЫСТА;
- ДЗЕНЬ УСІХ ЗАКАХАНЫХ;
- ДЗЕНЬ АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ;
- ШТО СВЯТКУЮЦЬ У ЛЮТЫМ;
- ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА;
- СТАРОНКА ТВОРЧАСЦІ;
- АБ’ЯВЫ.




# ДЗЕНЬ ЮНАГА ГЕРОЯ-АНТЫФАШЫСТА

## 8 лютага



Дзень юнага героя-антыфашыста быў зацверджаны чарговай Асамблеяй ААН. Гэты памятны дзень адзначаецца ў гонар загінуўшых удзельнікаў антыфашысцкіх дэманстрацый – французскага школьніка Даніэля Феры (1962) і іракскага хлопчыка Фадыла Джамаля (1963), савецкіх маладагвардейцаў (1943) Алега Кашавога, Любові Шэўцовай, Зміцера Агурцова, Віктара Субоціна, Сямёна Астапенка, расстраляных у гэты дзень нацыстамі. У 1964 году юныя інтэрнацыяналісты Масквы напісалі зварот да дзяцей усіх краін лічыць 8 лютага традыцыйным днём памяці юных герояў.

У 1998 году на II міжнародным зборы піянероў у Мінску па прапанове дэлегацыі нашай краіны было вырашана нараўне з памятнымі для ўсёй піянерыі датамі (9 мая – Дзень Перамогі і 19 мая – Дзень піянерскага сяброўства) адзначаць і 8 лютага – Дзень юнага героя-антыфашыста.






Традыцыйна да Дня юнага героя ў школе праходзяць піянерскія зборы. На зборах мы ўспамінаем і ўшаноўваем памяць тых, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з дарослымі са зброяй у руках абараняў сваю Радзіму. Прыйшоў час - яны паказалі, якім велізарным можа стаць маленькае дзіцячае сэрца, калі разгараецца ў ім святое каханне да Радзімы і нянавісць да яе ворагаў. І ні на імгненне не завагаліся юныя сэрцы!



# ДЗЕНЬ УСІХ ЗАКАХАНЫХ

## 14 лютага — Дзень святога Валянціна



**Гісторыя ўзнікнення Дня Святога Валянціна**

Дзень святого Валянціна, як свята закаханых, адзначаецца 14 лютага ў Еўропе з XIII стагоддзя.. У ЗША — з 1777*г*. У краінах СНД — з пачатку 1990-х гадоў.

Аб жыцці хрысціяніна Валянціна (нарадзіўся ў III ст.*н.э.*) амаль нічога не вядома. Бедныя факты трагічнай біяграфіі будуюцца з легенд, якія пярэчаць адна адной. Распавядаюць, што біскуп, быўшы маладым чалавекам, аказваў юным закаханым асаблівую ўвагу — дапамагаў пісаць пісьма з прызнаннямі ў каханні, мірыў пасварыўшыхся, дарыў кветкі маладым сем'ям. Арышт яго быў выкліканы нібыта тым, што рымскі імператар Юлій Клаўдзій II не дазваляў салдатам імперскіх легіёнаў кахаць і жаніцца, а Валянцін таемна вянчаў легіянераў.

Калі Валянцін сядзеў у турме, ён нібыта закахаўся ў сляпую дачку свайго ката — і вылечыў яе. Кажуць, што было наадварот: наглядчык папрасіў Валянціна вылечыць дачку, а тая закахалася ў святара. Перад пакараннем смерцю ён пакінуў ёй развітальную запіску і падпісаўся: «Твой Валянцін». Адсюль — і паштоўкі «*валянцінкі*», і само свята. Дата пакарання смерцю св. Валянціна супала з рымскім святам у гонар Юноны, багіні кахання. Гэты дзень у Рыме лічылі пачаткам вясны.

Сёння Дзень святога Валянціна вырваўся далёка за межы толькі каталіцкага і стаў самым масавым, самым любімым у многіх народаў святам.

******************************************




**День влюбленных – вот так праздник,**
**Отмечают все на свете:**
**И тихоня, и проказник,**
**И все люди на планете!**

**Пусть глаза сияют вечно,**
**И от счастья ты пари!**
**И в делах своих сердечных**
**Ты любовь всегда дари!**

# ДЗЕНЬ АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ



**23 лютага — свята мужнасці і адвагі! Нават маленькі хлопчык можа быць абаронцам. Хай пакуль яшчэ не Айчыны, але абараніць слабых, безабаронных — гэта вельмі важная справа. Дапамагчы маме і тату ў хатніх справах, перавесці пажылога чалавека праз дарогу, абараніць слабых — задача не для слабака, а для сапраўднага мужчыны.**

☆ ☆ ☆

**Віншуем з Днём абаронцы Айчыны! Ад усёй душы жадаем творчых поспехаў, здзяйснення ўсіх вызначаных планаў, стабільнасці і росквіту. Галоўнае, каб не грукаталі выбухі, не плакалі нашы матулі, а нашы дзеці жылі ў багатай і квітнеючай краіне і адчувалі гонар за сваю Айчыну! Мірнага неба і дабрабыту!**

☆ ☆ ☆




В этот праздник с должным уваженьем
Вспомним мы всех воинов, солдат,
Что Отчизною своею, без сомненья,
Больше жизни и здоровья дорожат.

Всех поздравим, всем поклон отвесим —
Низкий и глубокий, до земли.
Вам, защитникам народа от агрессий,
Похвала важнее, чем рубли.

Пожелаем вам отменного здоровья,
Многих достижений и побед,
Что размножатся в миру людской молвою,
Поднимая ваш авторитет!

# ШТО СВЯТКУЮЦЬ У ЛЮТЫМ?

## 15 ЛЮТАГА - ДЗЕНЬ ВЫВАДА ВОЙСКАЎ З АФГАНІСТАНА




Днём вывада войскаў з Афганістана афіцыйна прызнана дата 15 лютага 1989 года. У адпаведнасці з Жэнеўскімі дамовамі, прынятымі ў красавіку 1988 года, Савецкі Саюз павінен быў у тэрмін да 9 месяцаў вывесці з афганскай тэрыторыі сваіх салдатаў. Пачаткам адліку стала 15 мая 1988 года, адпаведна 15 лютага наступнага года апошні вайсковец, па афіцыйнай версіі гэта быў генерал-лейтэнант Барыс Громаў, перасёк мяжу, чым паклаў канец 10-гадовай кравапралітнай вайне.

*****************************************************

## 16 ЛЮТАГА - МАСЛЕНІЦА




Масленіца — старажытнае славянскае свята са шматлікімі звычаямі, праз стагоддзі якое дайшло да нашых дзён. Адзначаецца на працягу тыдня перад Вялікім пастом. Масленіца ў 2015 годзе адзначаецца з 16 па 22 лютага.

Масленіца — гэта вясёлыя провады зімы, адметныя радасным чаканнем блізкай цеплыні, вясновага абнаўлення прыроды. Галоўнымі атрыбутамі свята традыцыйна былі : пудзіла Масленіцы, забавы, коўзанне на санках, гулі і, вядома ж, бліны - круглыя, гарачыя; раней яны мелі рытуальнае значэнне, паколькі ўяўлялі сабой знак сонца, якое ўсё ярчэй разгаралася, падаўжаючы дні.

Магчыма, бліны былі і часткай памінальнага абраду, бо субота перад масленіцай пачыталася як «бацькоўскі дзень» — славяне ўшаноўвалі душы продкаў.

*****************************************************

## 21 ЛЮТАГА – ДЗЕНЬ ЗЕМЛЕЎПАРАДЧЫКАЎ І КАРТАГРАФА-ГЕАДЭЗІЧНАЙ СЛУЖБЫ БЕЛАРУСІ



21 лютага адзначаюць прафесійнае свята працаўнікі адной з найстарэйшых службаў Беларусі, якая займаецца картаграфіяй і геадэзіяй, прадставіць сабе працу геолагаў і землеўпарадчыкаў, географаў і гісторыкаў без якой немагчыма. Без карт — тапаграфічных, фізічных, палітычных — не абыйсціся ні вайскоўцам, ні турыстам, ні школьнікам. Таму крапатлівая праца людзей, якія даюць нам прадстаўленне аб краіне і свету, асабліва каштоўная.

# ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА

## Работа ў рамках праекта "Дабро лёгка тварыць!"



23 студзеня вучні школы ў чарговы раз наведалі дом-інтэрнат для псіханеўралагічных хворых з канцэртнай праграмай. Удзельнікамі праграмы сталі вучні 2, 5, 6 і 7 класаў. Вучні падрыхтавалі песні, вершы, танцы і пастаноўкі.Гледачы сустракалі юных артыстаў бурнымі апладысментамі.







## ПАЕЗДКА Ў ЛІДУ



24 студзеня 5 клас разам з 6 класам наведалі цэнтр тэхнічнай творчасці. Там было вельмі цікава асабліва для хлопчыкаў. Нам паказвалі прэзентацыю пра гэты цэнтр. Туды ходзяць і займаецца вельмі шмат дзяцей. Яны робяць макеты дамоў, замкаў і розных незвычайных пабудоў. А яшчэ яны робяць лодкі, самалёты, прыгожыя макеты машын, ракеты, якія умеюць лятаць, але да космасу яны яшчэ не далятаюць. У іх цэнтры ёсць від спорту, які называецца картынг. Картынг – гэта від спорту або забаўка, у якой дзеці ездзяць на гоначных аўтамабілях, але мы на іх не пакаталіся. Мы з класам вырашылі, што паўторым паездку вясной і абавязкова пакатаемся на гоначных аўтамабілях.



*Гаўрылюк Анастасія, вучаніца 6 класа*

# СТАРОНКА ТВОРЧАСЦІ

### Першы снег

Ах, першы снег, як ты прыгожы!
Дыханне лютае зімы.
Ты першы крок у жыцці пагожым
Як новы дзень сярод начы!

Ах, як прыгожы твае дзеці
У карагодзе дзіўных лет.
Гара ў небе белым цветам -
Адлюстраванне божацкіх павек.

І кожны, гледзячы ў неба, з заміраннем
Гатоў стаяць так назаўжды.
І любавацца гэтак доўга, да світання,
Ажно да самай, да вясны.

*Лагвіненка Алеся, 6 клас*

## КОНКУРС!

**Рэдакцыяй газеты аб'яўлены конкурс на лепшую назву для газеты і рубрык у ёй! Для ўдзелу Вам неабходна выказаць свае думкі наконт гэтага ў пісьмовай форме і падаць педагогу-арганізатару. Пераможца будзе абраны кампетэнтным журы.**

## Аб'ява

**Хутка свята? Хочаш павіншаваць аднакласніка ці настаўніка? Звяртайся ў рэдакцыю газеты! І ў газеце будзе апублікавана тваё віншаванне**




## *Гумарэска са школьнага жыцця*



Ответы на уроках:
- Придумай предложение с числительным "три".
- Моя мама работает на ТРИкотажной фабрике.



| | | | |
|---|---|---|---|
| **НАШ ГОЛАС** *Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –** Мінойтаўская СШ **Галоўны рэдактар –** Хіневіч Н.М. | **Афармленне:** Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:** в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |